© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

№ 35 (73)
2 сьнежня
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

**ТЭЛЕПРАГРАМА**
**20 MTV**
**5** Навіны на рынку бэстсэлераў.
**СПАЖЫВЕЦ**
**6** Выбіраем аўтапакрыўкі.
**КАМПУТАР**
**7** Новая кампутарная энцыклапэдыя.
**ШУФЛЯДА**
**10** Беларускі непадцэнзурны друк.
**РОЗНАЕ**
**12** Тэст: Вы і Ваш сын.
**Інфарматар**

## Час дысыдэнтаў

*На мінулым тыдні пад Варшавай праходзіла канфэрэнцыя былых дысыдэнтаў з усіх краінаў посткамуністычнай Эўропы.*

Былыя дысыдэнты ўспаміналі свае колішнія акцыі, а таксама турмы і лягеры, бо мала хто зь іх не **«сядзеў». Спасярод прадстаўнікоў Польшчы, Расеі,** Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Чэхіі, Вугоршчыны, Румыніі, Баўгарыі, бадай, толькі беларускія «дысыдэнты» не пачуваліся тут «былымі».

**Імя дыктатара Лукашэнкі гучала ў кожным выступленьні** як пагроза новае эўрапейскае бяды, новых рэпрэсіяў супраць правоў чалавека. Як ня дзіўна, але менавіта да беларускае дэлегацыі найбольш пасавала назва сустрэчы — «Час дысыдэнтаў», бо ўсе астатнія сёньня хутчэй вэтэраны барацьбы за правы чалавека.

*Пра міжнародную сустрэчу «Час дысыдэнтаў» чытайце на старонцы 3.*

*На тую ж тэму — артыкул Ігара Кузьняцова «З гісторыі савецкага дысэнту» — на старонцы 13.*

## Глядзіце, хто прыйшоў!



П о ш т а

## «Веру і спадзяюся...»

*«Генэральнаму пракурору Рэспублікі Беларусі*

*Лічу сваім грамадзянскім абавязкам падаць свой голас у абарону паэта Славаміра Адамовіча. Трымаць за кратамі чалавека толькі за тое, што яму Бог даў талент — дзікунства...*

*... Веру і спадзяюся, што Вы зробіце патрэбныя захады і паэт Славамір Адамовіч неадкладна будзе выпушчаны на свабоду...*

*Судзілоўская Л.І., Гомель».*

*«... Зьвяртаецца да Вас маці трох непаўналетніх дзяцей. У маім сэрцы пасяліўся даўгавечны жах за зямлю, дзе растуць мае дзеці... Старэйшы сын мой таксама спрабуе пісаць вершы, апавяданьні, вядзе дзёньнік... За гэта ж ужо 9 месяцаў за кратамі ўтрымліваецца паэт Славамір Адамовіч...*

*Ці вядома пану Пракурору такое паняцьце як Бог?...*

*Ганна Сьцепулёнак, Койданава».*

Гэта толькі некалькі радкоў, выпадкова ўзятых зь лістоў, якія прыходзяць сёньня ў рэдакцыю з розных кутоў Беларусі і зьвернутыя да Генэральнага Пракурора В.Капітана.

Тымчасам пасьля першага паседжаньня Віцебскі суд прыняў да ўвагі просьбу адваката С.Адамовіча сп. Паганяйлы і адтэрмінаваў слуханьні да 16 сьнежня. За гэты час мы можам зрабіць яшчэ шмат.

**С.Х.**




А к ц ы я

## «Аддайце нашы галасы!»

7 сьнежня на Плошчы Незалежнасьці а 12 гадзіне адбудзецца мітынг з удзелам дэпутатаў. Гэтае мерапрыемства будзе прысьвечанае абмеркаваньню правядзеньня і вынікаў рэфэрэндуму, які прайшоў 24 лістапада. Арганізатары спадзяюцца на ўдзел усіх, каму неабыякавы лёс краіны.

П э р ф о м а н с

## Сьмерць піянэра

Артур Клінаў, аўтар добра вядомага твору «За чаем», які летась быў выпушчаны адмысловай віншавальнай паштоўкай пад Новы Год, парадаваў менскую публіку чарговай «Сьмерцю піянэра». Гэтай выставе ў галерэі «6-я лінія» папярэднічаў пэрфоманс «Збор сродкаў на карысьць беларускіх палітычных зьняволеных», прэм'еру якога мастак паказваў з 25 жніўня ў Пецярбурзе на Фэстывалі экспазыцыйнага мастацтва. У Менску падчас апошніх маніфэстацыяў акцыя Клінава атрымала шырокае прызнаньне публікі: купляючы адну цукерку, людзі ахвяравалі грошы ў фонд палітвязьняў. Гэтак было сабрана паўтара мільёна рублёў, якія Клінаў перадаў «Бумбам-літу» для Славаміра Адамовіча. У Расеі такога посьпеху не было... Як кажуць: на аматара.

*Пра апошнюю выставу Клінава чытаце на стар. 16.*



*На здымку: Пэрфоманс Артура Клінава ў Пецярбурзе. Верасень, 1996 г.*

П о ш т а

## Зьдзек над храмам

*19 кастрычніка ў мястэчку Заслаўе часткова зьнішчаны агнём помнік XVI ст. — будынак Заслаўскага Рэфармацкага Збору (сёньня яго займае Расейская Праваслаўная царква). Цалкам выгарэла вежа і прыгожы дах з чырвонай дахоўкі.*

Друк стракацеў паведамленьнямі пра пажар, прычынай якога стаўся падпал, учынены нейкай сэктай «сатаністаў». Аднак пры ўсіх містыфікацыях гэтай гісторыі, факты кажуць пра іншае.

*Працяг на старонцы 16.*

М і ж н а р о д н ы   к а м э н т а р

## Гітлер ня прыйдзе

Ні легітымізаваных масавых забойстваў, ні перасьледу меншасьцяў, ні ўзаконенага цкаваньня за палітычныя погляды ў першыя гады кіраваньня фашыстаў у Італіі не было. Захавалася фармальная дэмакратыя, фармальная свабода слова. Вялася шалёная атака на сыстэму шматпартыйнай дэмакратыі, у якой сапраўды было шмат хібаў. Рэжым разграміў прафсаюзы.

Мусаліні вылучаўся сваім талентам прамоўцы, уменьнем рызыкаваць, рашучасьцю ў прыняцьці рашэньняў, добрым веданьнем народнай псыхалёгіі. Ён набыў сапраўды ўсенародную папулярнасьць: малады, незвычайны, сучасны, энэргічны. Мусаліні шмат езьдзіў па краіне, выступаў на мітынгах, удзельнічаў у спартовых парадах, мяшаўся ў кожную драбніцу і разгарнуў беспрэцэдэнтную на той час сыстэму прапаганды праз самы папулярны ў тую эпоху сродак камунікацыі — кіно.

Пара Мусаліні найлепш адлюстраваная ў фільмах Фэліні: цяпер тыя гады ўспрымаюцца хутчэй як камічныя, чым трагічныя, хоць ужо тады крывава душыліся выступленьні рабочых, некаторыя дзеячы апазыцыі зазналі вязьніцаў і выгнаньня, а афіцыйная агітацыя грунтавалася на ўзбуджэньні нянавісьці да замежных і ўнутраных ворагаў. Роднаснасьць сёньняшняга беларускага і тагачаснага італьянскага рэжымаў — і ў экзатычнасьці лёзунгаў і эксцэнтрычнасьці манераў лідараў.

*Працяг на старонцы 4.*

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# Незавершанасьць гісторыі

*Пад Варшаваю адбылася канфэрэнцыя па гісторыі апазыцыі ў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропе*

**Увесь мінулы тыдзень у ідылічным мястэчку Падкове Лесьнэй пад Варшаваю адбывалася канфэрэнцыя «ЧАС ДЫСЫДЭНТАЎ — спатканьне ўдзельнікаў і дасьледчыкаў апазыцыйных рухаў савецкага блёку ў Эўропе». Ролю арганізатараў спатканьня ўзялі на сябе ўжо вядомы нашым чытачам Цэнтар KARTA і Kolo Podkowy — Цэнтар культуры ў самой Падкове. Зь беларускага боку ўдзел у сустрэчы бралі Сяргей Дубавец (ад «Нашай Нівы») і Алег Дзярновіч (ад Архіву Найноўшае Гісторыі).**

## Беларускі кантэкст

Апошнія тыдні Польшча жыве ў атмасфэры насычанасьці інфармацыяй і хваляваньнямі з нагоды беларускіх падзеяў. Рэпартажы зь Менску зьяўляюцца на першых палосах найбуйнейшых газэтаў, паведамленьні зь Беларусі — абавязковыя ў тэле- і радыёнавінах. Каля беларускага пасольства рэгулярна адбываюцца пікеты пратэсту супраць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі. Заўважаная новая тэндэнцыя — палітычныя партыі Польшчы, усьведамляючы важнасьць беларускай праблематыкі, імкнуцца самастойна зазначыць сваю пазыцыю адносна гэтай тэмы, праводзяць кожная свае акцыі, часам не запрашаючы на тыя ж пікеты іншыя партыі.



«Кола Падковы» — асяродак, дзе адбывалася канфэрэнцыя. Уся Падкова Лесьна нагадвае парк.



Пра Беларусь гаворыць Аляксандар Гінзбург

Сёньня ў Польшчы пачалі зьяўляцца ня толькі навіны зь Беларусі, але й спробы аналітыкі. Самы сьвежы прыклад — эсэ прафэсара Ягелонскага ўнівэрсытэту Ўладзімера Паўлючыка «Рускія шляхі» ў апошняй «Politycy». Менавіта рускія, бо гутарка ідзе пра параўнаньне ўкраінскага ды беларускага нацыянальнага этасу. Лёзунг артыкула — Беларусь ня мае традыцыяў і герояў, якіх Украіна мае празьмерна. Паводле думкі аўтара, ідэя ўкраінскай нацыі нарадзілася ў XIX ст. з духовасьці й гістарычнага досьведу ўкраінскага праваслаўнага сялянства й казацтва. Ідэя ж беларускай нацыі нарадзілася тым самым часам з духовага й гістарычнага досьведу «польска-беларускай крэсовай шляхты й зьяўляецца ў дачыненьні да народа зьнешнім фэномэнам».

Гэта цікавыя тэзысы для пачатку дыскусіі. Між тым, варта заўважыць, што гэтая новая польская інтэлектуальная традыцыя зусім ня ўлічвае сёньняшнія рэаліі урбаністычнае Беларусі й існаваньне ўжо ўласна беларускай нацыянальнай традыцыі.

А тым часам усё больш і больш беларусаў просяць палітычнага прытулку ў Польшчы. На мінулым тыдні такіх стала ўжо дзевяць чалавек. Папрасілі прытулку, у тым ліку, Андрэй Рамашэўскі, які падпаў пад рэпрэсіі за ўдзел у Менскай вясьне, і студэнт зь Берасьця Ян Чурыловіч, які вучыцца ў Варшаве. Ян Чурыловіч разам з замежным назіральнікам з Украіны 24 лісапада наведвалі выбарчыя ўчасткі ў Берасьці, склаўшы каля 30 пратаколаў пра парушэньні працэдуры галасаваньня. На адным з участкаў назіральнікі былі схопленыя і зьбітыя міліцыяй, супраць іх узбудзілі судовую справу.

«Наш маральны абавязак — даць прытулак уцекачам зь Беларусі», — заявіў прэзыдэнт А.Квасьнеўскі. Бюро справаў міграцыі і ўчекачоў польскага МЗС паведаміла, што будзе ўважліва разглядаць заявы беларусаў і патрабаваць ад заяўлянтаў доказаў праўдзівасьці падставаў для статуса ўцекача.



Выступае Пятрушка Шуштрава — намесьнік міністра унутраных справаў у першым дэмакратычным урадзе Чэхіі, адзін з аўтараў чэскага закона аб люстрацыі.

## Рэзалюцыя

Беларускай тэматыкай быў цалкам прасякнуты першы дзень канфэрэнцыі — кожны выступоўца так ці інакш зьвяртаўся да беларускіх праблемаў. Аляксандар Гінзбург, які ў 1961 годзе заснаваў часопіс «Синтаксис», з 1967-га зь перапынкамі знаходзіўся ў лягерах, а ў 1979 г. быў абменены на савецкіх шпіёнаў і з 1979 году жыве ў Парыжы ды працуе ў газэце «Русская мысль», у сваім выступу шмат увагі надаў беларускай сытуацыі. Слынны расейскі дысыдэнт гаварыў пра дэмакратыю як пра сыстэму раўнавагаў у грамадзтве, а зусім не пра ўладу большасьці, пра тое, што А.Лукашэнка фармальна зьяўляецца дэмакратычна абраным лідарам, але ён ня мае нават элемэнтарных уяўленьняў пра такі панятак як правы чалавека.

Вельмі актыўнымі ў дыскусіях пра Беларусь былі лідары «Салідарнасьці» 80-х гадоў. А калі дэпутат польскага Сэйму Багдан Барусэвіч заявіў, што ўдзельнікі ня змогуць разьехацца, не прыняўшы рэзалюцыю ў абарону дэмакратыі ў Беларусі, заля проста выбухнула апляดысмэнтамі — гэта быў адзіны выпадак на працягу працы чатырох дзён эмацыйна досыць стрыманай канфэрэнцыі. Дыскусіі па рэзалюцыі працягваліся і на наступны дзень. Беларуская дэлегацыя прапанавала крыху адысьці ад агульнапалітычнага гучаньня дакумэнта й сканцэнтраваць увагу на неабходнасьці абароны правоў чалавека й свабоды слова ў Беларусі. Яшчэ праз дзень дэклярацыя была цалкам апублікаваная ў самым масавым польскім пэрыёдыку — «Gazecie Wyborczej». Вось тэкст дэклярацыі:



Чарга да падпісаньня рэзалюцыі канфэрэнцыі ў справе Беларусі.

У АБАРОНУ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА
І ДЭМАКРАТЫІ Ў БЕЛАРУСІ

У Беларусі парушаюцца правы чалавека, свабода слова й сходаў. Ужо восем месяцаў у затачэньні знаходзіцца паэт і журналіст Славамір Адамовіч, арыштаваны за свае вершы. У затачэньні таксама знаходзяцца сем грамадзянаў Украіны, затрыманых у Менску пад час веснавых грамадзкіх акцыяў пратэсту супраць палітыкі прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі. Працягваюцца чарговыя судовыя працэсы супраць апазыцыянэраў. Ліквідаваныя ды ліквідуюцца незалежныя мэдыі: Радыё 101,2 FM, газэты «Выбар» і «Пагоня».

Вынікі рэфэрэндуму 24 лістапада, праведзенага з парушэньнем беларускага заканадаўства, ва ўмовах аднабаковага прэсынгу кантраляваных уладамі сродкаў масавае інфармацыі, мы прызнаем за фіктыўныя. Органы кантролю за працэдураю галасаваньня былі зьліквідаваныя. Пад час галасаваньня адбываліся парушэньні. Беларусі пагражае пераход ад стану абмежаваньня дэмакратыі да стану дыктатуры.

Удзельнікі канфэрэнцыі дысыдэнтаў, якая адбываецца 26-29 лістапада ў Падкове Лесьнэй пад Варшаваю, выказваюць сваю рашучую падтрымку прадстаўнікам беларускіх дэмакратычных арганізацыяў і грамадзкасьці, якія ня згодныя з усталяваньнем у краіне дыктатуры.

Мы зьвяртаемся да нашых урадаў і парлямэнтаў з просьбаю паўплываць на ўлады Беларусі й выказаць пратэст супраць зьнішчэньня асноваў дэмакратыі й парушэньня правоў чалавека ў гэтай краіне.

Удзельнікі канфэрэнцыі «Час дысыдэнтаў», Падкова Лесьна, 27 лістапада 1996 г.



«Сейбіт і касец».
Да канфэрэнцыі было прымеркаванае адкрыцьцё выставы апазыцыйнага мастацтва 80-х гадоў. Сёньня у Польшчы ўжо так не малююць, гэта ўжо гісторыя мастацтва.

## Сярэдняя Эўропа ёсьць!

У гэтым пераконвае рэакцыя грамадзянаў нашага рэгіёну. Першым, хто адразу ж падыйшоў да нас і спытаў пра Беларусь і пра нашу газэту (ці не зачыненая яна?), быў славацкі эсэіст і выдавец Мілан Шымэчка. У верасьні ён прыяжджаў у Менск на канфэрэнцыю па Сярэдняй Эўропе і ўяўляе беларускія палітычныя рэаліі, ведае, што працягвае фармавацца незалежнае беларускае грамадзтва.

Здараліся і такія сюжэты, калі, напрыклад, на сьняданку да нашага століка падсаджваецца румынскі дысыдэнт Ромулюс Русан і пачынае ўсхвалявана распавядаць пра бачаную ім у тэлебачаньні цырымонію падпісаньня так званай Канстытуцыі 1996 г. Румынскага праваабаронцу абурыў цынізм уладаў.

Крыху нечаканай для беларуса можа стаць вялікая ўвага да беларускай сытуацыі ў вугорцаў. Гэтая ўвага нараджаецца з пачуцьця салідарнасьці. Вугорцы, якія перажылі 1956 год, асабліва чуйна рэагуюць на прагу іншых народаў да самавызначэньня. У Падкове Лесьнэй жыве былы пасол Вугоршчыны ў Польшчы й Беларусі Акаш Энгельмаер. Пасьля прыходу да ўлады ў Вугоршчыне посткамуністаў ён быў звольнены з дыпляматычнай службы. Сёньня сп. Энгельмаер можа распавесьці шмат цікавага пра тое, як былі заблякаваныя ў Беларусі ягоныя шматлікія культурныя ініцыятывы, а таксама ня зьдзейсьніўся буйны трактарны кантракт.

Мне, як самаму маладому ўдзельніку канфэрэнцыі й не дысыдэнту, было крыху няёмка з-за такой вялікай увагі слынных дысыдэнтаў і прэсы да беларусаў і да нас асабіста.

Мы прыехалі ў Падкову Лесьну ня скардзіцца. Мы прыехалі, каб зазначыць існаваньне незалежнага беларускага грамадзтва, каб заявіць пра нашыя інтарэсы й прапановы, увайсьці ў супольныя праекты. Але адчуваньне салідарнасьці давала нам пачуцьцё разнастайнасьці жыцьця і ўсьведамленьне незавершанасьці гісторыі.

**Алег Дзярновіч**
*(Заканчэньне будзе)*



Каб зрабіць свой канцэрт, у Падкову з Прагі прыехаў Сяржук Сокалаў-Воюш. Тут ён быў ня толькі з гітарай, але і зь відэакамэрай.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



Міжнародны камэнтар

# Гітлер ня прыйдзе

Працяг са старонкі 1.

Тады таксама браліся за перапісваньне падручнікаў: папулісцка-аўтарытарны рэжым прагнуў новых інтэрпрэтацыяў гісторыі, глебы для сваёй будучай таталітарнай мэтамарфозы.

Пэўныя рысы ўласьцівыя ўсім рэжымам, што імкнуцца да таталітарнасьці: падтрыманьне культу сілы, надмерная ўвага спорту, прыхільнасьць да ўсенародных плебісцытаў як сродку нагнятаньня грамадзкага псыхозу.

Мусаліні быў таксама першым кіраўніком Італіі, які ўрэгуляваў дачыненьні з царквой. Дыктатары граюць на нібыта дзяржаўніцкіх пачуцьцях царкоўнікаў. У гэткія гады адбываецца росквіт царквы як інстытуту дзяржавы і яе занапад як грамадзкага інстытуту і самакаштоўнай зьявы.

Савекая гістарыяграфія зблытала паняткі фашызму і нацызму ў імя даступных схемаў: «Ён быў за рускіх, а яна за фашыстаў». Італьянскі фашызм у першае дзесяцігодзьдзе свайго трыюмфу быў значна менш жорсткі, чым будучы гітлерызм. Мусаліні быў правобразам, прадвесьнікам Гітлера, прыкладам нямецкаму фюрэру, аднак беспартыйная італьянская дзяржава не спараджала гэткіх жахаў, якія спрычыніў Трэці Райх. На тое існавалі і важкія сацыяльныя прычыны, і рэч тут не ў самой ідэалёгіі фашызму і ня толькі ў нацыянальных якасьцях бонвіванаў-італьянцаў, якія ні разу за апошнія стагодзьдзі не дабіваліся ваенных перамог уласнымі сіламі (калі, вядома, не лічыць вайны з Альбаніяй).

Фашызм быў не такі жорсткі, але гістарычна і сацыяльна вельмі страшны і небясьпечны. Мусаліні даў прыклад, і зьявіліся Салазар у Партугаліі, генэрал Прыма-і-Рывэра ў Гішпаніі, адмірал Хорці ў Вугоршчыне, самакаранаваны кароль Зогу ў Альбаніі і іншыя рэжымы «навядзеньня парадку» і «прамой народнай дэмакратыі, адпаведнай нацыянальнаму характару».

Лукашэнка здаецца зусім лагодным дыктатарам, пакуль чакае зьяўленьня новага Гітлера. Але зьявіся гэты самы новы правадыр — а нарадзіцца ён можа перш за ўсё ў Расеі — і наш дробны каляніяльны аўтарытарызм пойдзе смутным шляхам, якім ішоў Мусаліні ажно да смутнага канца самога фюрэра. Пікантнасьць сытуацыі ў тым, што сам Лукашэнка ня траціць надзеі задаволіць патрэбу ў правадыры, калі яна раптам узьнікне ў суседнім народзе.

Менавіта і толькі прафашысцкія партыі — Славянскі сабор і лібэрал-дэмакраты — падтрымліваюць прэзыдэнта цяпер. Сябры якраз гэтых партыяў сядзелі ў студыі тэлебачаньня пад час наўпроставага этэру з удзелам прэзыдэнта. Сядзелі, выпраставўшы сьпіны і сувора склаўшы рукі на каленях, як і пасуе партайгеносэ.

Лукашэнка прыйшоў на пасаду на падтрымцы вайсковых адстаўнікоў, што не знаходзілі сабе месца ў новым ладзе, а таксама дзякуючы напалоханым пераменамі, пагрозьлівымі для іхняга панаваньня, так званым «кіраўнікам сярэдняга зьвяна», фактычна, той самай савецкай сярэдняй і дробнай буржуазіі, калі карыстацца сацыялістычнай тэрміналёгіяй. Вядома, не без дапамогі бедных і загнаных, прычараваных дэмагагічнай фразэалёгіяй.

Тое самае было і ў Італіі. Адстаўнікі першай сусьветнай ды напалоханыя выступленьнямі працоўных сярэднія ўласьнікі паверылі, што Мусаліні здатны скруціць супастатаў у бараноў рог, а тымчасам у паходы на Рым ужо ішлі за ім голыя і босыя.

Ня могуць не зьвяртаць на сябе ўвагу некаторыя зусім дробныя дэталі накшталт прызнаньня Лукашэнкі, што «ягоныя хобі — гэта спорт і машыны, і ён любіць сесьці ў машыну і сам езьдзіць па вуліцах гораду». Такое ўражаньне, што зьмест і стыль гэтых пасажаў сьпісаны з маніфэсту футурыстаў, аўтарам якога быў перадфашыст Марынэці.

Увогуле, паводле густаў і паводзінаў пэўных нашых дзеячоў можна вывучаць асаблівасьці посткаляніяльнай і пераходнай да урбаністычнай культуры.

Безумоўна, Лукашэнку і Мусаліні шмат што адрозьнівае. Зьмянілася эпоха. Ніхто ў Эўропе ня выказаў жаданьня пераняць прыёмы ці рыторыку беларускага лідара. Сумнеўнымі ўяўляюцца пэрспэктывы пабудовы карпаратыўнае беспартыйнае дзяржавы пры канцы XX ст. Поўны парадоксаў сам фэномэн мэсіянскага расейска-савецкага нацыяналізму, зь якога чэрпае беларускі дыктатар. Розная гістарычная мінуўшчына і розны культурны дынамізм падзяляюць тагачаснае Міжземнамор'е і посткаляніяльную прастору былой савецкай імпэрыі.

Але непрыемна ўжо тое, што нехта зноў чакае зьяўленьня патрэбы ў Гітлеру. Непрыемна, што нехта зноў выкарыстоўвае досьвед бессаромнай агітацыі, угрунтаванай на дасягненьнях псыхалёгіі і камунікацыяў. Але шанцаў паўтарыць гісторыю, хоць бы ў выглядзе фарсу, у іх, бадай, няма.

Але, можа, калі б не прыйшоў Гітлер, Мусаліні памяталі б як найнароднейшага кіраўніка, што асушыў італьянскае Палесьсе — Палезыну, перабудаваў і добраўпарадкаваў Рым і Нэапаль, праклаў па ўсёй Італіі аўтадарогі, паставіў мост ад Мэстрэ да Вэнэцыі, як натхняльніка велічных безгустоўнасьцяў тыпу алтара Бацькаўшчыны на плошчы Вэнэцыі ў Рыме? Не, бо было ўжо да Гітлера забойства апазыцыянэра-сацыяліста Матэоці, тупы фашысцкі тэрор — хто ня памятае «XX стагодзьдзя» Бэрталючы: дэвальвацыя праўды і хлусьні ў імя... Так, нельга зарабіць пашаны, робячы ўсё у імя славалюбства. Гістарычныя паралелі — рэч адвольная. Заганы канкрэтнага чалавека, аднак, нікуды не зьнікаюць.

**Андрэй Дынько**

# Патэнцыял балтыйскага рэгіёну

*Калі Літва, Латвія і Эстонія падалі заяўкі на далучэньне да NATO і ЭС, гэта спарадзіла гучныя расейскія пярэчаньні, а рэакцыяй астатняй Эўропы была абыякавасьць. Доктар Альгірдас Канаўка з Цэнтру стратэгічнага разьвіцьця ў Вільні прапануе зірнуць на праблему з пазыцыяў геастратэгічнага падыходу:*

У расейскіх спэцслужбаў і палітычных лідараў няма ніякіх падставаў сур'ёзна лічыць, што Захад хоча заваяваць альбо абрабаваць Расею. Захад меў мноства магчымасьцяў скарыстаць для экспансіі мінулыя пэрыяды крызысаў у СССР: сьмерць Сталіна, пуч 1991 г., праблемы Ельцына, — і Захад гэтага не зрабіў. Відаць, расейцы разглядаюць пашырэньне NATO на Ўсход як размываньне традыцыйнага стратэгічнага становішча сваёй краіны, што дае ёй падставы рыхтавацца да агрэсіўных дзеяньняў супраць Эўропы. Пашырэньне NATO на Ўсход магло б умацаваць пазыцыі Захаду ў ягоным процістаяньні агрэсіі з Усходу.

Без краінаў Балтыі ў Расеі зьнікае наяўнасьць пункту адштурхоўваньня, свайго роду трампліна для агрэсіўнага ўварваньня ў Эўропу. З другога боку, у выпадку, калі вайна зробіцца непазьбежнай, стратэгічнай перавагай для Захаду будзе зьяўленьне магчымасьці вядзеньня баявых дзеяньняў як мага далей на ўсходзе.

Ёсьць яшчэ адна прычына, зь якой краіны Балтыі важныя для Захаду: у сьвеце існуе блізу 190 розных краінаў, і толькі недзе 117 зь іх можна назваць цалкам дэмакратычнымі. У інтарэсах Захаду, каб такіх дэмакратычных краінаў было як мага болей, з той простай прычыны, што дэмакратыя спрыяе гандлю, палітычнаму супрацоўніцтву і культурнаму абмену. Што, у сваю чаргу, зьмяншае магчымасьць узьнікненьня вайны.

Што можа здарыцца, калі балтыйскі рэгіён будзе пакінуты па-за рамкамі NATO і будзе зноў акупаваны Расеяй? Па-першае, адсюль пацякуць патокі ўцекачоў, балтыйскае насельніцтва зробіцца непадкантрольным, што можа прывесьці да паўтарэньня ў цэнтры Эўропы балканскай ці чачэнскай трагедыяў. А псыхалягічным вынікам узьдзеяньня такіх драматычных падзеяў на насельніцтва астатняй часткі Эўропы можа быць звычайная паніка.

Расейскія радары і стратэгічныя наземныя і разьмешчаныя на бамбардавальніках ракеты цяпер практычна адведзеныя на 500 км на ўсход. У выпадку паўторнай акупацыі прыбалтыйскіх краінаў гэтыя расейскія сілы будуць зноў перадысьлякаваныя на захад, робячы Заходнюю Эўропу яшчэ больш прыступнай.

Адзіныя вайскова-марскія базы Расеі на Балтыйскім моры разьмешчаныя паблізу Калінінграду і Санкт-Пецярбургу. Усе яны прыступныя перад блякадай і паветранымі ўдарамі Захаду. У выпадку паўторнай акупацыі балтыйскіх краінаў Расеяй яе балтыйскія порты робяцца базамі для атакаў расейскага флёту на краіны, што выходзяць да Балтыйскага мора.

Вакол прыбалтыйскіх краінаў разьмешчаная вялікая колькасьць расейскіх наземных вайсковых сілаў, здольных акупаваць іх усяго за тыдзень, а то й хутчэй. Прыбалтыйскія краіны могуць проціластавіць Расеі агулам усяго тры дывізіі. Пасьля паўторнай акупацыі краінаў Балтыі трэба чакаць працяглага пэрыяду партызанскай вайны і грамадзкага непадпарадкаваньня, што сур'ёзна адаб'ецца на стабільнасьці ў Эўропе.

Геаграфічнае становішча прыбалтыйскіх краінаў зь іхнім гандлёвым патэнцыялам робіць іх падобнымі да краінаў Бэнілюксу: ключавыя пазыцыі для гандлю з Расеяй, Беларусяй, Украінай і Далёкім Усходам. Апошні ўсё ў большай ступені становіцца рынкам для збыту эўрапейскіх тавараў. Гэты вялізны рынак ужо цяпер стымулюе рост попыту на транспартныя сыстэмы (чыгунку, наземныя дарогі, паветраны транспарт), што праз краіны Балтыі і Расею пралягаюць з Эўропы на Далёкі Ўсход.

Пры вызначэньні інтарэсаў дэмакратычных краінаў трэба браць пад увагу і маральны бок. Менавіта маральнае вымярэньне спрычынілася ў часе другой сусьветнай вайны да супольнага змаганьня супраць краінаў Восі. Менавіта маральнае вымярэньне прывяло да падзеньня Савецкага Саюзу. Пасьля сямі дзясяткаў гадоў расейскі народ страціў мільёны жыцьцяў і многае са сваёй нацыянальнай душы. У эпахальным вяртаньні расейцаў назад мы мусім праявіць да іх спачуваньне і сымпатыю.

Былы прэм'ер-міністар Швэцыі Карл Більт сказаў, што межы шчырасьці Расеі на яе шляху да свабоды і дэмакратыі пакажуць яе адносіны да прыбалтаў. Тое ж слушна і ў дачыненьні ня толькі да Расеі, але й да Захаду. Калі Захад забудзецца на прынцыпы дэмакратыі і пагоніцца толькі за сваімі вузкімі эгаістычнымі інтарэсамі, тады ён страціць свой raison d'etre.

*The Baltic Times*

**Падрыхтваў Уладзімер Баранич**

Усходні Тымор

# Супраціў як адзіная форма існаваньня

Нобэлеўская прэмія міру за 1996 год была прысуджаная двум актывістам нацыянальнага і грамадзянскага руху ва Ўсходнім Тыморы — Карласу Бэла і Хасэ Рамасу Орці. Узнагарода засьведчыла: сьвет урэшце зьвярнуў увагу на лёс маленькага народу «маўбэрэ» (саманазва ўсходніх тыморцаў), над якім учыняецца генацыд.

Востраў Тымор быў захоплены партугальцамі ў 1586 г. Пазьней заходняя яго частка была далучаная галяндцамі да сваёй калёніі Нідэрляндзкая Індыя. Партугальцы валадарылі на Тыморы амаль 400 гадоў, з кароткім перапынкам у 1940-х, калі востраў кантралявалі японцы. Пад час партугальскай «рэвалюцыі гваздзікоў» у 1973-м на прыклад мэтраполіі ва Ўсходнім Тыморы пачаўся працэс дэмакратызацыі і дэкалянізацыі. Адбыўся выбух нацыянальнай самасьвядомасьці тыморцаў, зьявіліся нацыянальная літаратура, тэатар. Узьніклі ўласныя палітычныя арганізацыі, асноўныя зь якіх — Тыморскі Дэмакратычны Саюз (DUT) і Рэвалюцыйны Фронт Незалежнасьці Тымора (FRATELIN).

Але суседняя Інданэзія, дзе ў 1965 г. усталяваўся крывавы рэжым генэрала Сухарта, ахвярамі якога стала больш за мільён чалавек, прагнула валадарыць ва ўсім інданэзійскім архіпэлягу. З пункту гледжаньня Джакарты, Тымор правінен належыць Інданэзіі. Інданэзійскія спэцслужбы пачалі псыхалягічную вайну за «ўзьяднаньне». У заходняй частцы Тымору, падкантрольнай Інданэзіі, была створаная радыёстанцыя «Куранга» з прапагандысцкімі праграмамі за «інтэграцыю». У самім Тыморы пачала дзейнічаць праінданэзійская партыя «Ападэці», якая шчодра фінансавалася Джакартай.

Выбары 1975 году засьведчылі моц незалежнікаў ва Ўсходнім Тыморы. Большасьць месцаў у парлямэнце набралі DUT і FRATELIN, якія выступілі адзіным блёкам. Тады інданэзійскія спэцслужбы пачалі разьдзімаць антыкамуністычную гістэрыю, абвінавачваючы DUT у супрацоўніцтве з марксістамі з FRATELIN, і даволі ўдала: у жніўні 1975 году DUT арганізаваў пуч. У выніку сутыкненьняў загінула каля 2.000 чалавек, але пуч праваліўся. Лідары DUT зьбеглі ў Інданэзію, дзе пачалі прапагандаваць курс «на ўзьяднаньне».

Зь верасьня 1975 г. у памежных раёнах інданэзійскія войскі пачалі баявыя дзеяньні. Шырокамаштабная агрэсія стала пытаньнем бліжэйшага часу: авіяцыя Інданэзіі ўжо бамбіла гарады, а флёт абстрэльваў узьбярэжжа Тымора. Захад абыякава назіраў за акцыямі Джакарты, нават тады, калі ў кастрычніку падчас атакі на горад Баліба інданэзійцы забілі двух заходніх рэпартэраў. Прычынай маўклівай згоды стала тое, што Інданэзія была самым буйным спажыўцом зброі ў рэгіёне. Дарэчы, гісторыя са зброяй цягнецца і да сёньня. Напрыканцы лістапада 1994 году канцэрн «Россвооружение» пачаў перамовы пра продаж Інданэзіі партыі вынішчальнікаў МИГ-29. Зразумела, што пытаньне аб правах чалавека ў Інданэзіі не існуе для расейскага МЗС...

28 лістапада 1976 г. лідары FRATELIN абвесьцілі незалежнасьць Усходняга Тымора. Гэта быў выклік Інданэзіі — да пачатку ўварваньня засталося некалькі дзён (заходнія пасольствы эвакуявалі сваіх грамадзянаў). 7 сьнежня Інданэзійскія войскі высадзіліся ў Дылі — сталіцы Тымора — з мора і паветра. Сілы FRATELIN загадзя адыйшлі ў горы. У краіне пачалася партызанская вайна.

Зь першага дня акупацыі інданэзійцы распачалі тэрор супраць насельніцтва. Лічыцца, што лічба палеглых набліжаецца да 300.000 чалавек, блізу трэці насельніцтва.

Да канца 1978 г. інданэзійскія войскі пацiху сьціскалі кальцо вакол партызанскіх базаў. 31 сьнежня патрапіў у засаду і загінуў лідар FRATELIN Нікалаў Лобата. Сілы паўстанцаў былі разрозьненыя. Насельніцтва партызанскіх раёнаў перамясьцілі ў «стратэгічныя вёскі» (чытай, канцлягеры), дзе тыморцаў прымушалі вучыць інданэзійскую мову, вызнаваць іслам (большасьць тыморцаў — каталікі), паважаць сымбалі новага парадку — інданэзійскі сьцяг і герб. Было забаронена выкладаньне нацыянальнай мовы, гістрыі краіны. У сьпіс злачынстваў патрапілі нават народныя песьні і танцы.

Сухарта сьвяткаваў перамогу. Але да сярэдзіны 1979 году партызанскія атрады наладзілі сувязь паміж сабой. У канцы 1980 г. быў атакаваны тэлецэнтар у Дылі. Пачаўся новы этап супраціву.

На працягу 1980-88 г. партызаны аднавілі свае пазыцыі. Для барацьбы зь імі інданэзійцы вымушаныя былі ствараць спэцыяльныя батальёны з «правераных» мясцовых жыхароў, але гэта ўсё роўна не дапамагала.

У 1988 г. у глыбокім падпольлі была створаная Нацыянальная Рада Маўбэрскага Супраціву, якая аб'яднала ўсе нацыянальна-вызваленчыя сілы ва Ўсходнім Тыморы. У 1990 г. лідар паўстанцаў Кшанана прапанаваў Сухарта перамовы пад эгідай ААН. Дзеля таго, каб заявіць пра гэта на ўвесь Сьвет, паўстанцы правялі ў партызанскую зону аўстралійскага журналіста Робэрта Нома (гэта першы журналіст, які дабраўся да паўстанцаў за ўвесь час вайны): «Мы кажам супраціўляцца — значыць перамагчы! — сказаў Кшанана. — Але мы ня кажам пра ваенную перамогу. Мы патрабуем правядзеньня пад міжнародным кантролем рэфэрэндуму аб незалежнасьці».

29 кастрычніка 1991 г. інданэзійскія вайскоўцы напалі на каталіцкі касьцёл у Дылі і забілі 22-гадовага студэнта С.Гомэса, які хаваўся там. Паводле мясцовай традыцыі, на сёмы дзень пасьля пахаваньня ўскладаюць кветкі на магілу. Так атрымалася, што ў гэтыя дні ў Дылі прысутнічалі прадстаўнік ААН і заходнія журналісты. Было спадзяваньне, што іхняя прысутнасьць стрымае ўлады ад гвалту. Тыморцы выйшлі на жалобную дэманстрацыю. У раёне могілак Санта-Круз інданэзійскія салдаты занялі абарону. Амэрыканскія журналісты Э.Гудмэн і А.Дойры, каб не дапусьціць расправы, усталі паміж дэманстрантамі і салдатамі. Але салдаты ўсё адно распачалі бойню. У гэты дзень загінула больш за 200 чалавек. У канцы лістапада 1991 г. у Дылі быў арыштаваны Кшанана, якога Джакарцкі суд асудзіў да 20 гадоў зьняволеньня.

Нягледзячы на арышт правадыра, супраціў працягваецца. 13 лістапада 1994 г., калі ў горадзе Багор (в. Ява) пачалася сустрэча кіраўнікоў краінаў Ціхаакіянскага басэйну, у Дылі выбухнулі масавыя беспарадкі. Дэманстранты грамілі інданэзійскія крамы і ўрадавыя ўстановы. Чацьвёра дэманстрантаў былі забітыя паліцыяй. Апошнія зьвесткі з Тымора зьвязаныя з хваляй антыўрадавых маніфэстацыяў, якая пракацілася па ўсёй Інданэзіі ўлетку 1996 г.

Наўрад ці можна казаць пра магчымасьць ваеннай перамогі маленькага народу Ўсходняга Тымору над шматмільённай Інданэзіяй. Хутчэй размова ідзе пра тое, што адзінай імавернай формай існаваньня нацыі ва ўмовах акупацыі ёсьць супраціў. У іншым выпадку нацыя зьнікае.

**Лёлік Ушкін**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# З ГІСТОРЫІ САВЕЦКАГА ДЫСЭНТУ*

*Хрушчоўская «адліга» пачатку 60-х, калі за «жалезную заслону» ў СССР упершыню трапіў сьвежы заходні вецер, хутка зьмянілася чарговым «ледніковым пэрыядам». На ўвесь сьвет грымнулі справы пісьменьнікаў-дысыдэнтаў — Даніэля і Сіняўскага. Суд над імі адбыўся ў 1966-м; яны атрымалі тэрміны ў лягерах суворага рэжыму «за антысавецкую агітацыю і прапаганду, распаўсюджаньне антысавецкай літаратуры».*

*Інтэлігенцыя, хапіўшы глыток «адлігі», скалыхнулася. Зьявіліся шматлікія лісты-пратэсты — у Вярхоўны Савет, ЦК КПСС, Прэзыдуюм XXIII зьезду. Шырока вядомы адзін зь іх, падпісаны савецкімі (у тым ліку й беларускімі) пісьменьнікамі. Ішлі пратэсты ад студэнтаў, мастакоў, работнікаў выдавецтваў, навукоўцаў. Суслаў запатрабаваў «разабрацца і пакараць». На «падпісантаў» пачалі заводзіць асабістыя справы, іх «прапрацоўвалі» на сходах, звальнялі з працы.*

*Група дысыдэнтаў-інтэлігентаў, куды ўвайшлі А.Гінзбург, Ю.Галанскоў, А.Дабравольскі, В.Лашкова, выбрала іншы шлях — замест лістоў-прашэньняў пачалі зьбіраць матэрыялы працэсу: ня толькі пратаколы, але й меркаваньні пра суд, інтэрвію, вершы, нават показкі. Усё гэта ўвайшло ў «Белую кнігу», якая была перапраўленая за мяжу. Стваральнікаў кнігі арыштавалі і судзілі.*

*Іх арышт, у сваю чаргу, нарадзіў паток лістоў-пратэстаў і зваротаў. Праваахоўчыя органы пачалі бязьлітасную апрацоўку іншадумцаў: сачэньне, ператрусы, выклікі ў пракуратуру й г.д. Актыўна цкавалі іх і газэты. Палітбюро ЦК двойчы абмяркоўвала сытуацыю і даручыла В.Грышыну «разабрацца і спыніць».*

*У гэтых абставінах і зьявілася запіска-данос. Ю.Андропаў, старшыня КГБ, мог сам накіраваць яе «наверх». Але характэрна, што такога роду палітычныя дакумэнты ён імкнуўся ніколі не падпісваць аднаасобна. Са свайго боку, В.Грышын таксама імкнуўся надаць запісцы законную форму, атрымаўшы подпіс Генэральнага пракурора краіны Р.Рудэнкі. Пазначаны й той, на загады якога арыштоўвалі і прыходзілі зь ператрусам — міністар унутраных справаў СССР М.Шчолакаў.*

Зусім сакрэтна

ЦК КПСС

У апошнія месяцы прапагандысцкія цэнтры імпэрыялістычных дзяржаваў актыўна выкарыстоўваюць у сваёй антысавецкай дзейнасьці судовы працэс у справе ГІНЗБУРГА, ГАЛАНСКОВА, ДАБРАВОЛЬСКАГА і ЛАШКОВАЙ. Рэакцыя буржуазнага Захаду на гэты працэс вылілася ў адкрыты паклёп на савецкі дзяржаўны і грамадзкі лад, у імкненьні арганізаваць кампанію супраць СССР як дзяржавы, у якой нібыта адсутнічаюць дэмакратычныя свабоды.

Непасрэдную дапамогу супраціўніку ў распальваньні варожай кампаніі чыняць сваімі дзеяньнямі ГРЫГАРЭНКА, ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН, ЯКІР, ЛІТВІНАЎ і БАГАРАЗ-БРУХМАН, якія фактычна пайшлі на супрацоўніцтва з Захадам.

Выступаючы ў ролі памагатых найбольш рэакцыйнай часткі прадстаўнікоў буржуазнай прэсы і радыё, яны сыстэматычна забясьпечваюць іх паклёпніцкімі матэрыяламі, спрабуюць праводзіць прыватным парадкам прэсавыя канфэрэнцыі для іншаземцаў; падбухторваюць антыграмадзкія элемэнты да палітычна шкоднай дзейнасьці, інсьпіруюць выраб і распаўсюджаньне варожых паводле свайго зьместу лістоў, заяваў, «пратэстаў», правакацыйна вядуць сябе ў дачыненьні да органаў улады.

ГРЫГАРЭНКА П.Г., 1907 году нараджэньня, украінец, былы член КПСС (выключаны ў 1964 годзе), былы генэрал-маёр Савецкай Арміі, майстар аддзелу забесьпячэньня БУ-20 Масбуду-4. У 1963 годзе ад імя выдуманага «Саюзу барацьбы за адраджэньне ленінізму» вырабіў і распаўсюдзіў антысавецкія ўлёткі, за што пастановай суда як псыхічна хворы накіроўваўся на прымусовае лячэньне. У 1966 годзе ўзяў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы «мітынгу памяці ахвяраў сталінізму». У пэрыяд судовага працэсу ў справе ГІНЗБУРГА і іншых сваімі правакацыйнымі паводзінамі ў будынку суда спрыяў паклёпніцкаму асьвятленьню працэсу замежнымі журналістамі. У 1968 годзе склаў і імкнуўся накіраваць дакумэнт варожага зьместу ўдзельнікам Кансультацыйнай нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партыяў у Будапэшце.

ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН А.С., 1924 году нараджэньня, габрай, беспартыйны, кандыдат фізычна-матэматычных навук, малодшы навуковы супрацоўнік Усесаюзнага інстытуту навуковай і тэхнічнай інфармацыі. У 1949 годзе арыштоўваўся па вінавачаньні ў прavядзеньні антысавецкай прапаганды. У ходзе сьледзтва быў прызнаны непрытомным і накіраваны на прымусовае лячэньне. У 1959 годзе зноў быў арыштаваны за антысавецкую дзейнасьць і накіраваны на прымусовае лячэньне. У 1965 годзе прымаў удзел у «мітынгу галоснасьці» на плошчы Пушкіна. На працягу 1965-1967 гадоў сыстэматычна сустракаўся з іншаземцамі... Арыштаваны ў студзені 1967 года грамадзянін ФРГ эмісар НТС ШАФХАЎЗЭР меў заданьне перадаць ВОЛЬПІНУ-ЯСЕНІНУ два інструктыўныя лісты і антысавецкую літаратуру. Пад час судовага працэсу ў справе ГІНЗБУРГА і іншых быў арганізатарам зборышчаў каля будынка суда, удзельнічаў у складаньні правакацыйных зваротаў, частку зь якіх перадаў заходнім карэспандэнтам.

ЯКІР П.І., 1923 году нараджэньня, габрай, беспартыйны, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытуту гісторыі АН СССР, зьяўляецца адным з асноўных арганізатараў акцыяў падбухторваньня, якія праводзіліся пад сьцягам «барацьбы з наступствамі культу асобы». Прымаў удзел у распаўсюджаньні ўлётак палітычна варожага зьместу паз назвай «Грамадзянскі зварот», праводзіў збор подпісаў пад лістом дзяцей рэпрэсаваных.

ЛІТВІНАЎ П.М., 1940 году нараджэньня, расеец, беспартыйны, працаваў выкладчыкам Маскоўскага інстытуту тонкай хімічнай тэхналёгіі, звольнены ў студзені сёлета за парушэньне працоўнай дысцыпліны. Актыўна ўдзельнічаў у розных антыграмадзкіх акцыях. У пэрыяд сьледзтва і суда ў справе ГІНЗБУРГА і іншых вёў апрацоўку сьведкаў і дабіваўся ад іх паказаньняў на карысьць абвінавачаных. Сумесна з БАГАРАЗ-БРУХМАН склаў паклёпны зварот «Да сусьветнай грамадзкасьці» і разам зь іншымі правакацыйнымі матэрыяламі перапраавіў яго за мяжу. У цяперашні час зьбірае матэрыял для паклёпнага рукапісу пад умоўнай назвай «Белая кніга-2».

БАГАРАЗ-БРУХМАН, Л.І., 1929 году нараджэньня, габрайка, беспартыйная, кандыдат філялягічных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытуту тэхнічнай інфармацыі, клясыфікацыі і кадаваньня Камітэту стандартаў. Сыстэматычна выступае ў якасьці аўтара-распаўсюдніка палітычна шкодных рукапісаў «Аб адной паездцы» і «Мае паказаньні», зваротаў да дзеячоў навукі і культуры ў абарону ДАНІЭЛЯ і да «Сусьветнай грамадзкасьці» ў справе ГІНЗБУРГА і іншых. Неаднаразова забясьпечвала іншаземцаў паклёпнай інфармацыяй.

Органамі пракуратуры і дзяржбясьпекі з ГРЫГАРЭНКАМ, ВОЛЬПІНЫМ-ЯСЕНІНЫМ, ЯКІРАМ, ЛІТВІНАВЫМ і БАГАРАЗ-БРУХМАН неаднаразова праводзіліся папераджальныя гутаркі, аднак усё гэта ніякага дзеяньня на іх не аказала. Больш таго, ужо пасьля папярэджаньняў ЯКІР прыняў актыўны ўдзел у вырабе, пашырэньні ў СССР і перадачы на Захад новага правакацыйнага звароту «Да дзеячоў навукі, культуры і мастацтва СССР», у якім сьцьвярджаецца пра адсутнасьць у Савецкім Саюзе палітычных свабодаў, узводзіцца паклёп на дзейнасьць партыйнага і дзяржаўнага апарату, зьмяшчаецца зварот да грамадзкасьці выступіць за перагляд лініі партыі.

Аўтары «Звароту», характарызуючы савецкую рэчаіснасьць, указваюць: «На працягу некалькіх гадоў у нашым грамадзкім жыцьці пазначаюцца злавесныя сымптомы рэстаўрацыі сталінізму. Найбольш ярка выяўляецца гэта ў паўторы самых страшных дзеяньняў гэтай эпохі — у арганізацыі жорсткіх працэсаў над людзьмі, якія адважыліся адстойваць сваю годнасьць і ўнутраную свабоду, паспрабавалі думаць і пратэставаць... Бесчалавечныя расправы над інтэлігентамі — гэта лягічнае завяршэньне атмасфэры грамадзкага жыцьця некалькіх апошніх гадоў. Наіўным надзеям на поўнае аздараўленьне грамадзкага жыцьця, уселеным у нас рашэньнямі XX і XXII зьездаў, не ўдалося збыцца... Ні адзін з дэмакратычных пачаткаў не даведзены да канца... У грамадзкіх навуках працягвае накідацца згубны і незваротны дыктат кан'юнктуры».

«Зварот» сканчаецца правакацыйным заклікам да дзеячоў навукі, культуры і мастацтва «падняць свой голас супраць наступу небясьпекі новых сталіных і яжовых... Вы пастаўленыя ў такія ўмовы, што выкананьне свайго грамадзянскага абавязку — кожны раз акт мужнасьці. Але ж выбару таксама няма — альбо мужнасьць, альбо баязьлівы саўдзел у брудных справах...»

Становіцца відавочным імкненьне пададзеных асобаў надаць сваёй антыграмадзкай дзейнасьці шырокі размах, уцягнуць у яе дзеячоў навукі, культуры і мастацтва і знайсьці арганізацыйныя формы гэтага «руху». У адным з варыянтаў «звароту», атрыманага апэратыўным шляхам, гаворыцца: «Мы заклікаем вас да стварэньня аўтарытэтнай грамадзкай арганізацыі, якая зможа, мінаючы бюракратычны апарат, уступаць у непасрэдныя дачыненьні з урадам, абараняючы правы, свабоду, жыцьцё, годнасьць людзей, баронячы краіну ад магчымасьці адраджэньня сталінізму у любой форме».

Паклёпны «зварот» і лісты ГРЫГАРЭНКІ, ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА, ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, перададзеныя замежнымі радыёстанцыямі, сталі вядомымі варожа настроеным асобам у Савецкім Саюзе і ўспрымаюцца імі як сьведчаньне актыўнай палітычнай барацьбы. Кватэры ГРЫГАРЭНКІ, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, прыцягваюць да сябе рознага кшталту антысаветчыкаў, якія спэцыяльна прыяжджаюць у Маскву для абмеркаваньня зь імі плянаў далейшых правакацыйных выступаў.

У гутарках з асобнымі зь іх ЛІТВІНАЎ дапушчае антысавецкія заявы: «... Цяпер ставіць пытаньне аб сыстэме (маецца на ўвазе дзяржаўны і грамадзкі лад СССР) рана... Няхай улада трымаецца на штыхах, але ж народ яе прыняў. Яна штосьці дае, узровень крыху павышаецца... Тое, што мы робім не палітычная барацьба, гэта барацьба за магчымасьць палітычнай барацьбы... Пытаньне пра сыстэму можна ставіць у размове, але шырока яго ня ставім. Пакуль рана».

ГРЫГАРЭНКА, ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН, ЯКІР, ЛІТВІНАЎ і БАГАРАЗ-БРУХМАН упэўненыя ў антысавецкім характары сваёй дзейнасьці, але спыняць яе не зьбіраюцца, бо, як яны кажуць, упэўненыя, што ў цяперашні час да іх ня будуць ужытыя меры пакараньня. У гутарцы зь Якірам адзін зь яго аднадумцаў проста заявіў: «Яны ні цябе, ні Паўліка (ЛІТВІНАЎ) не пасьмеюць пасадзіць, таму што на Захадзе гучыць: сын і ўнук...»

Такім чынам, паводзіны гэтай групы людзей набываюць усё больш дзёрзкі характар, а беспакаранасьць іх дзейнасьці выклікае ў многіх савецкіх грамадзянаў неразуменьне.

Пракуратура СССР, Камітэт дзяржбясьпекі і Міністэрства аховы грамадзкага парадку ва ўчынках ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА, ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН знаходзяць склад злачынства, прадугледжанага арт. 190 1 КК РСФСР (пашырэньне заведама ілжывых меркаваньняў, якія ганьбяць Савецкі дзяржаўны і грамадзкі лад). Аднак прыцягваць іх да крымінальнай адказнасьці ў цяперашні час, на нашую думку, немэтазгодна, бо гэтая мера можа выклікаць новую хвалю дэмагагічных патрабаваньняў з боку антыграмадзкіх элемэнтаў унутры краіны і падбухторных дзеяньняў буржуазнай прапаганды.

У зьвязку з гэтым выносім наступныя прапановы:

— даручыць пракурору горада Масквы ўзбудзіць у адносінах да ГРЫГАРЭНКІ крымінальную справу па арт. 190 1 КК РСФСР, падвергнуць яго арышту і накіраваць яго на судова-мэдычную экспэртызу. У залежнасьці ад вынікаў экспэртызы вырашыць пытаньне пра перадачу ГРЫГАРЭНКІ ў суд альбо пра накіраваньне яго на прымусовае лячэньне;

— дазволіць ВОЛЬПІНУ-ЯСЕНІНУ выехаць у ЗША для ўдзелу ў рабоце сымпозіюму па матэматычным аналізе (афіцыйнае запрашэньне з ЗША у яго ёсьць. У тым выпадку, калі ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН пад час знаходжаньня ў ЗША скампрамэтуе сябе нявартымі паводзінамі, разгледзець пытаньне аб пазбаўленьні ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА савецкага грамадзянства і закрыцьці яму ўезду ў СССР;

— ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН выклікаць у Пракуратуру СССР і ў катэгарычнай форме запатрабаваць неадкладнага спыненьня антыграмадзкай дзейнасьці. Папярэдзіць ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, што ў адваротным выпадку яны будуць пазбаўленыя прапіскі і выдаленыя з Масквы.

У зьвязку з гэтым лічым неабходным унесьці дапаўненьні ў Пастанову Савета Міністраў СССР ад 15 жніўня 1966 году №658-211 «Аб умацаваньні пашпартнага рэжыму ў гарадах Маскве, Ленінградзе і Маскоўскай вобласьці» (праект дадаецца);

— даручыць Массавету (калі папярэджаньне не падзейнічае) на падставе дапаўненьня да ўказанай Пастановы Савета Міністраў СССР прыняць рашэньне аб пазбаўленьні ЯКІРА; ЛІТВІНАВА маскоўскай прапіскі тэрмінам на 2 гады;

— даручыць Міністэрству аховы грамадзкага парадку выдаліць ЯКІРА і ЛІТВІНАВА з Масквы, вызначаўшы месца жыхарства ЯКІРУ ў Цюменьскай вобласьці, ЛІТВІНАВУ ў Гур'еўскай вобласьці Казахскай ССР;

— пытаньне аб пазбаўленьні прапіскі і выгнаньні з Масквы БАГАРАЗ-БРУХМАН разгледзець дадаткова ў залежнасьці ад яе паводзінаў пасьля прымяненьня ўказаных санкцыяў у дачыненьні да ЯКІРА і ЛІТВІНАВА;

— падрыхтаваць і апублікаваць у газэце «Советская Россия» ў дзень ажыцьцяўленьня санкцыяў у дачыненьні да ГРЫГАРЭНКІ, ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА, ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, паведамленьня па гэтым пытаньні.

АНДРОПАЎ ГРЫШЫН РУДЭНКА ШЧОЛАКАЎ

3 красавіка 1968 году №731-а

Адпраўлена Камітэтам Дзяржбясьпекі пры СМ СССР

Падрыхтаваў Ігар Кузьняцоў

** Дысэнт — сукупнасьць праяваў дысыдэнцкай актыўнасьці.*

# Kalandar

KALANDAR

## 2 śniežnia

U hety dzień... u 1805 h. Napaleon adznačyŭ hadavinu svajoj karanacyi źniščalnaju pieramohaj nad abjadnanymi rasiejska-aŭstryjackimi vojskami pad Austerlitz (siońnia Slaŭkaŭ pad Brnom u Čechii). Hetuju bataliju nazyvajuć jašče «bitvaj troch imperataraŭ».

U 1859 h. u Charlestown u Virginii byŭ pavieśany John Brown, amerykanski zmahar suprać rabstva.

Naradzilisia: biełaruski mahnat Januš Radzivił (1612); dr Jozeph Bell (1837-1911), edynburski lekar, jaki staŭ pravobrazam Sherlocka Holmesa — heroja detektyŭnych apovieściaŭ Arthura Connan Doyle; dziajač biełaruskaha adradženskaha ruchu Feliks Stackievič (1879); biełaruski kampazytar Mikoła Ravienski (1886); saviecki maršał Gieorgij Žukov (1896-1974); Peter Carl Goldmark (1906-77), narodžany ŭ Vuhorščynie vynachodnik kalarovaha telebačańnia; hreckaja opernaja śpiavačka Maria Callas (1923-77).

## 3 śniežnia

U hety dzień... u 1967 h. u Cape Town dr Cristian Barnard zrabiŭ pieršuju ŭ historyi pierasadku serca.

U 1913 h. pamior biskup Stafan Danisievič, pačynalnik adradžeńnia biełaruskaj movy ŭ kaściole.

## 4 śniežnia

U hety dzień... u 1942 h. fašysty zakatavali Vieru Charužuju.

Naradzilisia: rasiejski mastak Vasilij Kandinsky (1866-1944); niamiecki paet Rainer Maria Rilke (1875-1926); heneral Francisco Franco (1892-1975), fašyscki dyktatar u Hišpanii.

## 5 śniežnia

U hety dzień... u 1791 h. u Vienie pamior Wolfgang Amadeus Mozart (jamu było tryccać piać hadoŭ) i byŭ pachavany ŭ bratniaj mahile dla žabrakoŭ.

U 1917 h. u Miensku pačaŭsia Pieršy Ŭsiebiełaruski Kanhres.

Naradzilisia: maršał Juzef Piłsudzki (1867-1935); Walter Elias Disney (1901-66), amerykanski multyplikatar; hišpanski tenar Jose Carreras (1946) i biełaruski paet Aleś Razanaŭ.

## 6 śniežnia

U hety dzień... u 1877 h. amerykanski vynachodnik Thomas Alva Edison zrabiŭ pieršy ŭ historyi hukavy zapis.

Naradziłasia kniazioŭna Barbara Radzivił (1520-1555), kachanka karala Žyhimonta Aŭhusta — ichni ślub vyklikaŭ usieahulnaje abureńnie.

## 7 śniežnia

U hety dzień... u 1941 h. ataka japoncaŭ na Pearl Harbor na Havajskich Vyspach spravakavała ŭstupleńnie USA ŭ druhuju suśvietnuju vajnu.

## 8 śniežnia

U hety dzień... naradziŭsia finski kampazytar Jean Sibelius (1865-1957).

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010





*Малюнак Сяргея Харэўскага*

зь пераляку намачыў штаны, хтосьці згубіў пальчатку, твар адных зноў стаў звыклага колеру — але яны не маглі адкрыць рот, іншыя маглі гаварыць, але ўсё яшчэ стаялі зьбялеўшы. І ніхто ня ведаў, куды і калі падзеўся Прэзыдэнт.

А проста — на ніжняй прыступцы адной зь лесьвіц ляжаў вялікі барабан. Калі ён з грукатам пакаціўся ўніз — усе і кінуліся хавацца: ратуйся, хто можа.

*Пераклаў з гішпанскай*
**Андрэй Дынько**

Адам Глёбус

# ГАНІЦЕЛЬКА

*Апавяданьне*

«У маёй душы няма злосьці», — мужчына паўтараў мэдытацыйны сказ у розных станах, разнастайнымі інтанацыямі, уголас і пра сябе столькі разоў, пакуль не адчуў, што злосьць нарэшце пакінула душу. Толькі новы стан не дадаў радасьці. Ідучы па праспэкце, мужчына знайшоў выраз для ачышчэньня: «У маёй душы няма смутку». Узрадаваны, ён наведаў букіністычную краму — цемнаватую, пыльную, поўную танных кніжак і пастарэлых прадаўшчыц, якіх ведаў зь дзяцінства. Ніводнае выданьне яго не зацікавіла. Адно незанавешанае вакно крышку разьвеяла сум. Нават не само чысьцюткае вакно, а краявід за ім: двор, засаджаны вербамі, арэлі-гушкалка і лімонная лаўка.

Паўтараючы запаветны сказ: «У маёй душы няма смутку», — мужчына даволі далёка адышоў ад букініста, але выгляд жоўтай лаўкі пад нахіленай вярбою ніяк не выходзіў з галавы. Ён вярнуўся. Двор стаў пусты, чыста вымецены, ціхі. Раптам з праспэкту праз выгбу ў двор заляцела двое сямі-васьмігадовых дзяцей. Хлопчык уцякаў, дзяўчынка даганяла. Дзеці шумна пераляцелі двор. Уцякач схаваўся за пад'езнымі дзьвярыма, а задыханая Ганіцелька села побач з мужчынам.

— Думаеце, я не змагла яго дагнаць? — Ганіцелька цікавала рэакцыю. Яна была падобная да акуратнай лясной жабкі: лупаценькая, смуглявая, шырокая.

— Ня ведаю.

— Магла і хацела ўдарыць і пабіць, але енку было б на ўвесь горад, з пад'езду выскачыў бы ягоны старэйшы брат. Удваіх яны мацнейшыя.

— Ты разумна зрабіла, біцца ня трэба. У чалавека не павінна ў душы кіпець злосьць.

На Ганіцельцы спраўна сядзелі: белая куртка, сінія нагавіцы й чорныя красоўкі. Яна па-мужчынску трымала рукі на каленях.

— Ці можаце Вы паверыць, што старэйшы брат гэтага хлопца, за якім я гналася, адразу пайшоў ня ў першую, а ў трэцюю клясу?

— Цяжка верыцца. Гэта тое самае, як пераканаць сябе, што ў душы няма смутку.

— І я сумняваюся. Гэта я пайшла адразу ў трэцюю клясу; а ён, як дазнаўся, прыдумаў гісторыю з разумным братам. Проста, праўда?

— Здагадацца нескладана.

— Я так і сказала: падманшчыкі.

— А яны пакрыўдзіліся?

— Азьліліся. Я залезла на вярбу і з дрэва крыкнула ашуканцам: «Вы хлусы». Яны пачалі трэсьці вярбу, я звалілася й зламала дзьве рукі. Я займалася акрабатыкай, таму пасьпела згрупавацца й прызямліцца на чатыры кропкі, як котка. Каб не асфальт, абыйшлося б.

— А чым скончылася?

— Над букіністычнай крамай жыве мая бабуля, яна хірург, займаецца пераломамі. Мне наклалі гіпс. Замест рук былі белыя заечыя лапкі.

— А што зрабілі з братамі?

— Нічога. Я не сказала, хто разгойдваў вярбу.

— У цябе няма злосьці?

— Няма. На неразумных, як на жывёлаў, нельга крыўдзіцца. Калі Вы нешта зламаеце, нагу ці руку, абавязкова прыходзьце да маёй бабулі.

— А калі б ты забілася?

— Сьмерць нічога не зьмяняе. Вось зараз браты выйдуць з пад'езду і пойдуць да гушкалкі. Малодшы залезе на седала, а старэйшы пачне яго разгойдваць да самага неба. Я падыйду да іх і скажу: «Пагайдайце мяне». «Калі ласка», адкажа старэйшы і падштурхне мяне да арэляў. Жалезная труба разаб'е маю галаву. Такое здараецца ў любым горадзе раз ці два на год. Можаце спытаць у моргу. Распаўсюджаны трагічны выпадак.

Ганіцелька не пасьпела дагаварыць, як у двары зьявіліся хлопчыкі, старэйшы і малодшы. Яны падбеглі да арэляў. Двор запоўніла жалезнае рыпеньне і воклічы ўцекача: «Вышэй. Вышэй! Вышэй!!!»

«У душы няма смутку», — падумаў мужчына, назіраючы, як у вакне букініста пакупнікі гартаюць кнігі.

— Пайду...

— Не смуткуйце...

Мужчына накіраваўся да аркі. Ганіцелька пабегла да арэляў.

На праспэкце мужчыну дагнаў двухгалосы хлапечы крык, і знайшоўся новы супакаяльны сказ: «Душа пустая».

*10.11.1996*

# МАСТАЦТВА?*

аўтаматычна трансфармаваць чалавецтва ў ... ну, скажам, у чалавецтва, тады дайце такому чалавеку пачытаць загалоўкі ранішніх газэтаў. Але ж, скажаце вы, калі нашая дзівосная эпоха — гэта не Залаты Век гуманных дачыненьняў братоў і сёстраў, то як жа ёй быць яшчэ і Залатым Векам мастацтва? Многія літаратары ўзяліся паразважаць (якраз іхныя разважаньні, уключаючы меркаваньні майго сябра Свэна Біркерца, вы знойдзеце на старонках нашай віртуальнай дыскусіі (будуць зьмешчаныя ў наступных нумарах «НН» — **У.Б.**)) пра тое, ці трансфармуе сучасная тэхналёгія чалавечую мэнтальнасьць. А калі трансфармуе, то ці не прывядзе гэта да непазьбежных зьменаў у характары літаратурнага і мастацкага досьведу і практыкі, што ў выніку зробіць «традыцыйныя» мэтады і формы безнадзейна састарэлымі?

На такое глябальнае пытаньне ў мяне няма гатовага адказу. Усё занадта сур'ёзна. Я чакаю і назіраю. Але пры гэтым я мяркую, што ўсяму віною незакілзаны матэрыялізм. А паколькі сапраўднае мастацтва заўсёды ёсьць перахадніком ад фізычнага да мэтафізычнага, яно заўсёды выступае адлюстраваньнем нематэрыяльных вымярэньняў жыцьця — нашых «каштоўнасьцяў». Таго, што мы самагубча ігнаруем. Падобна, што ўвогуле ўся сучасная чалавечая культура пачувае сябе някепска, ігнаруючы тое. Тут, у лічбавым сьвеце інтэрнэтаўскай кібэрпрасторы, дзе, як лічаць некаторыя, у нас найменей шанцаў яго сустрэць, мы шукаем мастацтва ці, можа, магчымасьць праявы мастацтва, магчымасьць давесьці існаваньне лічбавага мастацтва насуперак усім «не» скептыкаў.

Мой сябар паэт шмат кпіў з Залатога Веку, я таксама часам іранізую наконт Залатога Веку. Я люблю казаць, што гэта быў сапраўды шчасьлівы дзень, калі Боб Дылан узяў у рукі электрагітару. Я маю на ўвазе тое, што ў Боба Дылана хапіла розуму пакарыстацца электронікай насуперак скавытаньню і шкадаваньню ягоных «традыцыйных» фанатаў і, без сумневу, ягоных імпрэсарыё. У выніку такога пераходу зьявілася музыка «кантры» надзвычайнай навасьці — электрычная музыка, якая нічым не саступае, а то й пераўзыходзіць традыцыйную акустычную. Тое ж самае я адчуваю і ў адносінах да Майлза Дэвіса. Ці аказаліся «электрычныя» кампазыцыі Дылана і Дэвіса такімі ж удалымі, як і іхныя найлепшыя акустычныя кампазыцыі? Ці аднолькава яны і састарэлі? Як я ўжо сказаў вышэй, гэта неістотна. Гаворка не пра гэта. Сапраўдны мастак не ляжыць у «традыцыі», нібыта ў труне. Калі б сёньня жылі Бах і Чарлі Паркер, Шэксьпір і Джэймс Джойс, яны стваралі б ня так, як яны рабілі гэта ў свой час. Але яны б пісалі свае творы.

Мой сябар паэт, напэўна, сказаў бы, што сёньня не магло б быць ані Баха, ані Шэксьпіра, ані Чарлі Паркера. А я кажу, што Джэймс Джойс, для прыкладу, знайшоў, як выканаць «электрычнае сола» без электрагітары Fender ці мультымэдыйнага камputara.

Апошняя заўвага: калі мы разважаем пра «лічбавую культуру», то ня маем на ўвазе антрапалягічных дасьледаваньняў кампутарнай прамысловасьці ці паводзінаў спажыўцоў, ці любоўных раманаў праз электронную пошту. Хаця й немагчыма было б цалкам аддзяліць «культуру» (мастацтва і літары) у лічбавых сродках перадачы ад «культуры» тых, што працуюць з такімі лічбавымі сродкамі перадачы. Іх узаемаўплыў , іх узаемапранікненьне непазьбежна стануць часткай нечага аднаго, пра што мы і спрабуем тут разважаць. Усё, на шчасьце, на прыемнасьць і без усялякіх прабачэньняў, зводзіцца да аднаго — да мастацтва.

*The Atlantic Monthly (Internet)*
**Падрыхтаваў Уладзімер Бараніч**

**Гэты матэрыял працягвае віртуальную Інтэрнэтаўскую дыскусію аб праблемах прыгожага мастацтва ў кампутарную эпоху.*



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

